ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

30 МАЯ
1996 года
чацвер

№10 (1746)

Чалавек першай паласы

"Я веру, што гэтую ільдзіну мы зрушым!"

Мусіць, няма такога чалавека, які пасля заканчэння ВНУ не згадваў бы з асаблівай цеплынёй свой інтэрнат. Інтэрнат для студэнта не толькі другі дом, але і аснова ўсяго студэнцкага жыцця. Напэўна, таму ў студэнцкіх колах пасялілася прымаўка: "Хто не жыў у інтэрнаце, той студэнцкага жыцця па-сапраўднаму не ведае". Інтэрнат... Менавіта тут пачынаецца школа жыцця... Але сёння, калі наша дзяржава перажывае не самыя лёгкія часы, цяжкая эканамічная сітуацыя б'е па самых неабароненых слаях насельніцтва — студэнцтву. З кожным годам у інтэрнатах узнікае ўсё больш і больш праблемаў.

Знаёмцеся, Ала Уладзіміраўна Мелех, дырэктар студгарадка БДУ,— адна з тых людзей, хто імкнецца палепшыць студэнцкі побыт у інтэрнатах. Скончыла БДУ, фізічны факультэт, замужам, мае дзіця. Жыве ў інтэрнаце, на сённяшні дзень свайго жылля не мае. Па ейных словах, гэта, напэўна, і прывяло да таго, што яна засталася на гэтай працы. Зараз атрымлівае другую адукацыю, юрыдычную.

— На жаль, дрэннага на сённяшні дзень значна болей, чым добрага. Праблем узнікае вельмі шмат. Большасць з іх наўпрост звязаныя з адсутнасцю сродкаў. За апошні год, напрыклад, нічога новага з мяккай і цвёрдай мэблі мы не атрымалі. Проста катастрафічна не стае сантэхнічнага абсталявання: яно сыплецца поўнасцю, а замяніць няма чым. Апроч таго, па ўсё тых жа матэрыяльных прычынах смецце з інтэрнатаў доўга не вывозіцца, бялізна мыецца нясвоечасова, дэзапрацоўка не праводзіцца. Вельмі складана знайсці прыбіральшчыцу, дворніка, смецяправодчыка, ізноў-такі з прычыны малога заробку. А нясвоечасовыя прыборкі, канешне ж, на стане інтэрнатаў адбіваюцца негатыўна.

— Скажыце, ці не могуць самі студэнты прыбіраць паверхі?

— Мы спрабавалі ўвесці самаабслугоўванне, дзяжурствы на паверхах, але, на жаль, беспаспяхова. Таму што студэнт сёння, апынуўшыся ў цяжкіх эканамічных умовах, вымушаны ў вольны ад навучання час падпрацоўваць і ўвесь дзень заняты. Не ведаю, як будзе ў наступным годзе. Можа быць, што яшчэ больш складана. Бо, як вядома, колькасць жылых пакояў у інтэрнатах скарацілася прыкладна на 300: адно крыло інтэрната № 5 пайшло пад навучальны корпус падрыхтоўчага аддзялення, і арэнда 150 месцаў у інтэрнаце № 10 на вуліцы К.Маркса не апраўдвае сябе. Плаціць 150 млн. рублёў штомесяц за арэнду універсітэт пакуль не ў стане. Амаль усе нашыя інтэрнаты, безумоўна, не новыя, і многае ўжо даўно патрабуе капітальнага рамонту, але пакуль давядзецца задавальняцца гэтым. Хацелася б, каб і студэнты разумелі гэта і ашчадна ставіліся да таго, што ёсць. А то пачасту здараецца так, што ў пачатку года студэнт атрымлівае і крэслы, і сталы, і люстэрка, і радыё... Але напрыканцы года загадчыцы абсалютна няма чаго прымаць.

— І ў адрамантаваным інтэрнаце № 5 адбываецца тое ж самае?

— Я не магу сказаць нічога аб беларускіх студэнтах, паколькі ў пятым інтэрнаце жывуць замежнікі. Але на працягу навучальнага года захаваць інтэрнат у першапачатковым выглядзе нам удалося. Можа быць, і таму, што там існуюць спецыяльныя дзяжурныя па паверхах, якія сочаць за парадкам, арганізуюць пры патрэбе прыборкі разам са студэнтамі ды інш.

Думаю, калі універсітэту ўдасца адрамантаваць па такому ж прынцыпу яшчэ хаця б два інтэрнаты, то мы зможам захаваць парадак, прычым не на адзін год, а як мінімум гадоў на пяць.

— Акрамя праблем у інтэрнатах, напэўна, ёсць і добрыя пачынанні?

— Так, энтузіязм і аптымізм студэнтаў вельмі цешыць. Сёлета асабліва актыўна ўзнаўляецца гуртковая работа. У інтэрнатах № 7 і № 3 адкрыліся танцавальныя гурткі: яны нават давалі бясплатныя канцэрты на 8 сакавіка і на 9 мая. У інтэрнаце № 2 функцыянуе клуб тэхнічнай творчасці. А інтэрнат № 8 славіцца сваім "Таварыствам дружбы", якое існавала і ў ранейшыя часы, а зараз узнавіла працу. Замежныя студэнты і аспіранты атрымліваюць тут цудоўную падтрымку, паколькі ў "Таварыстве дружбы" ім не толькі дапамагаюць авалодаць рускай мовай, але і знайсці сваіх землякоў у іншых ВНУ Мінска.

— Хаця працуеце Вы на новай пасадзе не так даўно, з лістапада 1995 года, верагодна, у Вас ёсць ужо пэўныя планы на будучыню.

— Шчыра кажучы, аб планах гаварыць яшчэ не даводзіцца. Пакуль я вымушаная разграбаць тое, што накапілася. Я сама была студэнткай і ведаю, што такое інтэрнат, калі ты прыязджаеш з роднага дома ў чужы горад, застаешся адзін, без бацькоў. Таму хочацца дапамагчы дзяўчатам і хлопцам, каб ім жылося ўтульна і паўсюль адчувалася хатняя абстаноўка. Сёння гэта вельмі складана і, на жаль, не ўсё атрымліваецца. Але я аптыміст і веру, што гэтую ільдзіну мы зрушым!

— Дзякую за размову.

Вольга Хадарэнка

Фестывалі

Студэнцкаму фестывалю ў Вязынцы 20 год. Сёлета ён быў прысвечаны 75-ай гадавіне БДУ

Анатоль Васільевіч ПАЎЛАЎ, прарэктар па вучэбнай рабоце і сацыяльных пытаннях:

— На маю думку, фестываль прайшоў добра. Было вясёла і цікава. Асабіста мне вельмі спадабаліся і запомніліся спартыўныя спаборніцтвы. Прыемна і цудоўна, што не перавяліся ў нашым універсітэце слаўныя асілкі, хлопцы моцныя і спартыўныя, якія запраста падымаюць гіру ў 24 кг 161 раз.

Аднак не менш прыемна было бачыць, як тыя ж асілкі не паленаваліся і прыбралі пасля сябе ўсё смецце. І гэта вельмі важны факт. Менавіта з такога чулага стаўлення да навакольнага асяроддзя і павінна выхоўвацца любоў да нашай Радзімы, нашай сінявокай Беларусі. Бо вялікая любоў пачынаецца з малога: з любові да свайго дома, сяброў, лесу, возера і г.д.

Я лічу, што такія фестывалі трэба праводзіць і ў далейшым. Думаю, што ў многіх студэнтаў Вязынка і яе сустрэчы застануцца ў памяці на доўгія гады.

Павел СКАЛАБАН, студэнт 4-га курса біялагічнага факультэта, член аргкамітэта фестывалю "Белдзяржуніверсітэт-96":

— Перадусім хацелася б выразіць вялізную падзяку рэктарату і дэканатам факультэтаў, якія аказалі дапамогу і падтрымку ў арганізацыі і правядзенню фестывалю. Хацелася б таксама падзякаваць аддзелу па справах моладзі за дапамогу ў арганізацыі фестывалю, прафсаюзнаму камітэту — за фінансавую падтрымку мерапрыемства, кафедры фізвыхавання і спорту і спартыўнаму клубу універсітэта — за разнастайную і насычаную спартыўную праграму, ваеннай кафедры і гаражу універсітэта — за добрае аўтатранспартнае забеспячэнне фестывалю, а таксама ўсім супрацоўнікам і студэнтам БДУ, якія зрабілі гэты фестываль сапраўдным святам.

На жаль, кепскае надвор'е прынесла крыху клопату гасцям і арганізатарам фестывалю, але гэта не пашкодзіла вызначыць мацнейшыя каманды факультэтаў па многіх відах спартыўных спаборніцтваў. Так, па выніках усіх спаборніцтваў першае месца занялі каманды ММФ і юрфака, другое — каманда фізічнага факультэта, трэцяе — геаграфічнага. Трэба адзначыць добрую арганізаванасць гэтых камандаў і высокі спартыўны дух.

Я лічу, што фестываль у Вязынцы, які стаў ужо традыцыйным, спрыяе яднанню студэнтаў розных факультэтаў, дае вялізарны зарад бадзёрасці і аптымізму ўсім ягоным удзельнікам, застаецца адным з найбольш яскравых уражанняў і ўспамінаў пра БДУ.

Падрыхтоўчае аддзяленне для замежных студэнтаў. На занятках па фізіцы. Выкладчык Валасюк Галіна Фёдараўна

ДАІ паведамляе

Увага: аперацыя "Дзеці"!

З 1 па 31 мая ў Мінску праводзіцца аперацыя "Дзеці". Яна выкліканая ростам дарожна-транспартных здарэнняў (ДТЗ) з удзелам дзяцей. Работнікі ДАІ праводзяць у школах гутаркі з навучэнцамі па Правілах дарожнага руху, звяртаючы іх увагу на захаванне дысцыпліны на дарозе.

Мы звяртаем увагу бацькоў на неабходнасць пастаяннага кантролю за сваімі дзецьмі і пры гэтым заклікаем іх быць прыкладам у выкананні ПДР.

Не павінна быць абыякавых да лёсаў дзяцей. Асабліва гэта тычыцца вадзіцеляў транспартных сродкаў. Каля школы ўстанаўліваецца знак абмежавання хуткасці да 40 км. Вывешваецца плакат "Увага, дзеці!" Пра гэта "забываюць" многія вадзіцелі, перавышаючы хуткасць на такім участку. Для іх і чырвоны сігнал светлафора не з'яўляецца забароненым.

Усе ўдзельнікі дарожнага руху: вадзіцелі і пешаходы, — будзьце ўважлівымі да дзяцей, вучыце іх сваім прыкладам паважаць законы дарогі!

Начальнік Маскоўскага аддзялення ДАІ падпалкоўнік А.Слесарэнка

А ў маі плады збіраем

Так, у студэнтаў і школьнікаў усё не так, як у людзей. Калі іншыя толькі сеюць, у нас ужо збіраюць. Збіраюць плады навучальнага года.

У ліцэі пры Белдзяржуніверсітэце прагучаў апошні званок, пачаліся экзамены, залікі. У залікових кніжках ліцэістаў з'явіліся сёлета і новыя прадметы: машынапіс, стэнаграфія...

Нядаўна праводзіўся выніковы занятак па машынапісу. Няблага авалодалі клавіятурай нашы юныя машыністкі: добра атрымліваліся ў іх дуплеты і перакаты, цудоўна выконвалі яны і самае цяжкое практыкаванне — клінышкі. Усё гэта новыя прыёмы вертуознай працы на клавіятуры, распрацаваныя на курсах стэнаграфіі і машынапісу пры Белдзяржуніверсітэце.

На жаль, не ўсе, хто пачынаў вывучаць машынапіс, дайшлі да фінішу. Але як бы цяжка ні было, многія ліцэісты добра засвоілі клавіятуру, зразумелі, як трэба працаваць з дакументамі. Яны атрымалі пасведчанні сакратароў-рэферэнтаў.

Былі падведзеныя вынікі і па вывучэнню стэнаграфіі. За адзін навучальны год многія засвоілі праграму, разлічаную на два гады: прайшлі ўсю тэорыю і курс практыкі. Яны атрымалі пасведчанні стэнаграфістаў. Верагодна, поспех ліцэістаў тлумачыцца тым, што іх не прымушалі зубрыць, а толькі паказвалі, як на аснове вядомых правілаў самім знаходзіць добрыя скарачэнні.

Вялікую самастойнасць, уменне творча думаць праявіла Вікторыя Рашкевіч, якая амаль самастойна (пры дапамозе кансультацый) навучылася стэнаграфіраваць па-беларуску. А Алена Ушакова збіраецца ўжо стэнаграфіраваць і па-англійску. У наступным годзе нам трэба будзе больш увагі надаць стэнаграфіраванню на розных мовах: дапаможнік па нямецкай стэнаграфіі ў нас падрыхтаваны ўжо, рыхтуем і англійскі варыянт.

У.Герасімаў (Дзянісаў)

У Акадэміі навук

З 20 па 24 мая ў Акадэміі навук Беларусі прайшоў III Мінскі міжнародны форум па цепла- і масаабмену. У ім прынялі ўдзел каля 600 вучоных з больш чым 20 краін свету. ЗША, Японія, Паўднёвая Карэя, Германія, Францыя, Вялікабрытанія -- далёка не ўвесь пералік краін далёкага замежжа, якія прыслалі ў Мінск сваіх прадстаўнікоў. Вялікімі былі дэлегацыі ад нашых суседзяў-- Расіі, Украіны, Літвы, Польшчы. Аналагічныя мерапрыемствы праводзяцца ў Мінску раз у чатыры гады, пачынаючы з 1961 года (да 1988 года яна мела статус Усесаюзнай канферэнцыі з запрашэннем замежных вучоных). III ММФ стаў апошнім у XX стагоддзі, таму на ім падводзілі вынікі не толькі мінулага чатырохгоддзя, але і ўсіх папярэдніх дзесяцігоддзяў. IV форум мяркуецца правесці ў 2000 годзе.

На Вучоным Савеце

Справаздача аб навукова-даследчай рабоце універсітэта за 1995 год

На адным з пасяджэнняў Вучонага Савета слухаўся даклад аб навукова-даследчай дзейнасці універсітэта за 1995 год. Справаздачу рабіў Анатоль Іванавіч ЛЕСНІКОВІЧ, прарэктар па навуковай рабоце.

I. АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА

На фоне вядомага вам бесперапыннага і ўсеагульнага спаду першай паловы 90-х гадоў 1995 год характарызуецца адноснай стабільнасцю, прынамсі, у становішчы спраў у Беларусі ў сферы навукі, хаця колькасць работнікаў гэтай сферы працягвала скарачацца і дасягнула прыблізна 43 тысячы чалавек, сярод якіх толькі 1560 прафесараў і каля 2000 дактароў навук. Прыкладна на ўзроўні папярэдняга года захавалася фінансаванне навуковай сферы, а фармальна ў расходнай частцы бюджэту яно нават узрасло з 1,4% у 1994 годзе да 2,7% у 1995 і практычна зраўнялася з адпаведнымі расійскімі паказчыкамі. Аднак гэтая стабільнасць не павінна супакойваць: у разліку на 1 чалавека, занятага ў навуцы, дзяржава выдаткавала ў год прыкладна 1,6 тысяч долараў ЗША (для параўнання — на Украіне 0,7 тысяч, у Паўднёвай Карэі 60 тысяч, у ЗША 180 тысяч, у БДУ у разліку на навуковых супрацоўнікаў і ПВС па параграфу 53 — 2 тысячы долараў).

Памеры заробку ў 1995 годзе вы добра ведаеце — галоўны навуковы супрацоўнік (доктар) з усімі надбаўкамі атрымліваў каля 75 долараў. Цікава параўнаць яго з заробкам доктара навук ва Украіне, які складае каля 25 мільёнаў карбованцаў (прыблізна 140 долараў). Асабліва засмучае малая розніца ў акладах ніжэйшага і вышэйшага звёнаў у навуцы. Так, у Расіі гэтая розніца для малодшага навуковага супрацоўніка і дырэктара інстытута складае каля 110 долараў, а ў Беларусі па цяперашніх тарыфах — каля 37 долараў. Можна толькі з сумам пажартаваць, што да мяжы нам яшчэ далёка: сярэдні заробак у АН Арменіі — каля 7 долараў у месяц.

Намінальна фінансаванне БДУ у 1995 годзе ўзрасло ў 9 разоў у параўнанні з папярэднім годам і дасягнула 53430,5 мільёна рублёў. Аднак гэты рост не павінен успрымацца літаральна, паколькі ён не адлюстроўвае сапраўднага становішча рэчаў з-за інфляцыі. Істотнай была падтрымка міжнародных фондаў. Толькі па праграме INTAS, пачынаючы з 1993 года, універсітэт разам з НДІ і замежнымі партнёрамі ўдзельнічаў у праектах на суму 793,6 тысяч долараў ЗША; з Міжнароднага навуковага фонду ў 1995 годзе атрымана 83,8 тысяч долараў (без уліку дапамогі бібліятэцы і навукоўцам для паездак на канферэнцыі і на стажыроўкі — 15 паездак). У межах двух праектаў праграмы ТЭМПУС у 1995 годзе БДУ атрымаў аргтэхніку, камп'ютэры, бібліяграфічную базу данных па прыродазнаўчых навуках "Паскаль" на суму 150 тысяч долараў. У цэлым фінансаванне гэтых праектаў складзе каля 1 мільёна долараў. Выконваецца шэраг кантрактаў з замежнымі партнёрамі. Акрамя таго, індывідуальныя гранты падтрымкі па праграме Беларускага Фонду Сораса "Абнаўленне гуманітарнай адукацыі" атрымалі 22 чалавекі (у тым ліку 14 студэнтаў і 3 аспіранты). У БДУ 17 Сорасаўскіх прафесараў (з 30, адзін — заслужаны), 9 дацэнтаў (з 18), 17 аспірантаў (з 52), 107 студэнтаў (з 359 на 1994/1995 навучальны год). Усё гэта гаворыць аб тым, што ўдзел у міжнародных навукова-даследчых і адукацыйных праектах істотна папаўняе бюджэт. Адзначу, што ў 1996 годзе бюджэт Беларускага Фонду Сораса ўзрастае ў 1,5 разы і складае 7 мільёнаў долараў.

Аналіз змянення кадравага патэнцыялу таксама сведчыць аб пэўнай стабілізацыі сітуацыі, бо скарачэнне колькасці навуковых работнікаў выкліканае практычна толькі сыходам з БДУ у БДПА Міжнароднага лазернага цэнтра, у тым ліку двух дактароў навук. Аднак змяншэнне ліку кандыдатаў навук на 63 чалавекі (у асноўным у НДЧ БДУ і НДІ ПФП) выклікае трывогу перш за ўсё па дзвюх прычынах: сыходзяць маладыя і мала абаранялася кандыдацкіх дысертацый (31 у 1995 годзе). Па гэтых жа прычынах зменшылася і колькасць дактароў навук — у справаздачным годзе абаронена толькі 9 доктарскіх дысертацый.

Адзначу, што ў АН РБ сітуацыя з кандыдацкімі дысертацыямі ў разліку на аднаго навуковага супрацоўніка такая ж, аднак паказчык абароны доктарскіх вышэй у 1,5 раза.

Не павінен параджаць ілюзіі і рост колькасці аспірантаў. У некаторых ВНУ ён узрос на трэць, прычым не толькі ў Беларусі, але і ва Украіне. Таму цікавы пункт погляду прэзідэнта Украіны Л.Кучмы на гэтае пытанне. На нарадзе па рэфармаванню навукі 15.02.96 г. ён сказаў, што аспірантура "становіцца трохгадовай стажыроўкай за кошт дзяржавы для маладых бізнесменаў".

У 1995 годзе Белдзяржуніверсітэт у цэлым удзельнічаў у выкананні 20 рэспубліканскіх праграм, па 2 з якіх ён быў галаўным, 11 міжвузаўскіх як галаўны і 3 унутрыуніверсітэцкіх.

Шырокае прызнанне атрымаў шэраг працаў нашых навукоўцаў. Пастановай Прэзідыума АН РБ прысуджаны прэміі Акадэміі навук Беларусі:

Габасаву Рафаілу Фёдаравічу (разам з супрацоўнікам АН Кірылавай Ф.М.) за цыкл працаў "Распрацоўка канструктыўных метадаў вырашэння эксперыментальных задач", якія не толькі атрымалі шырокае міжнароднае прызнанне, але і вызначаюць галоўныя тэндэнцыі ў развіцці метадаў тэорыі кіравання;

Камарову Льву Іванавічу і Феранчуку Іллі Давыдавічу за працу "Аператарны метад рашэння ўраўнення Шрэдзінгера і яго дадаткі", якая выклікала ў сусветнай літаратуры цэлую серыю публікацый, прысвечаных мадыфікацыі гэтага метаду, названага метадам Камарова-Феранчука.

Па намінацыі "Лепшая навуковая праца маладых навукоўцаў" прэмію атрымалі малодшы навуковы супрацоўнік Карпук С.М. (фізічны факультэт), аспірант Асіповіч М.П. (хімічны факультэт) (дзве прэміі з пяці).

Прэміямі АН адзначаныя таксама студэнцкія навуковыя працы Угрыновіч К.А. (філасофска-эканамічны факультэт), Талапін Дз.В. (хімічны факультэт) і Карэлін М.В. (фізічны факультэт) (тры прэміі з пяці).

Трэба адзначыць, што БДУ стаў неафіцыйным пераможцам па ліку грантаў маладых навукоўцаў ФФІ — 36 %.

Рашэннем Савета БДУ прэмія імя У.І Пічэты прысуджаная прафесару Зелянкову А.І. за цыкл працаў па філасофіі і метадалогіі навукі, у якіх дадзены аналіз праблемаў пераемнасці ў развіцці навуковага пазнання, пытанняў структуры і развіцця экалогіі як навукі, рэабілітацыі насельніцтва ў сацыяльна-псіхалагічным аспекце і метадалогіі сацыяльна-гуманітарнай адукацыі.

Прэмія імя А.Н.Сеўчанкі прысуджаная прафесару Антаневічу А.Б. і дацэнту Лебедзеву А.У. за цыкл працаў па С*— тэорыі функцыянальна-дыферэнцыяльных аператараў, апублікаваных у больш за 100 навуковых артыкулах і манаграфіі, выдадзенай за мяжой па-англійску. У гэтых працах развіты новы агульны метад даследавання функцыянальна-дыферэнцыяльных ураўненняў, які не мае сусветнага аналагу.

За лепшую работу студэнтаў у галіне сацыяльных і гуманітарных навук прэмія прысуджана студэнцы філалагічнага факультэта Жылінскай І.А., а ў галіне прыродазнаўчых навук — студэнту факультэта радыёфізікі і электронікі Хейдораву І.Э.

Дактарант Дойнікаў А. (НДІ ЯП) атрымаў першую прэмію ў конкурсе Фонду Сораса на лепшую публікацыю 1995 года сярод маладых навукоўцаў. Сярод іншых пераможцаў гэтага конкурса Сямак І. (біялагічны факультэт), Кельін А., Дзікі У. (абодва з хімічнага факультэта), Мядзведзеў У. (факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі).

Кніга прафесара Мячкоўскай Н.Б. "Сацыяльная лінгвістыка", выдадзеная ў Маскве, перамагла ў адкрытым конкурсе "Абнаўленне гуманітарнай адукацыі ў Расіі", які праводзіўся Міністэрствам адукацыі Расіі і Міжнародным фондам "Культурная ініцыятыва".

На кафедры англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў падрыхтаваныя навуковыя дапаможнікі, якія хутка разышліся і выкарыстоўваюцца ў навучальным працэсе як у ВНУ Беларусі, так і Расіі, Эстоніі і Польшчы: "Contact English" у трох частках (Лузгіна С.В., Шавалдышава А.З., Варывончык В.Ф.) і "Lotta" (навучальны дапаможнік для школаў) (Лузгіна С.В., Лукша Т.Г.). Увесь тыраж (120 тысяч) Міністэрства адукацыі і навукі РБ накіравала ў школы і ліцэі Беларусі.

II. ВАЖНЕЙШЫЯ ВЫНІКІ НДР

Пра некаторыя дасягненні механіка-матэматычнага факультэта ў навуковай рабоце я ўжо ўзгадваў.

Значныя поспехі дасягнутыя таксама на кафедры тэорыі функцый у галіне інтэгральных пераўтварэнняў і дробавага вылічэння, якія маюць вялікія магчымасці прымянення ў матэматыцы, механіцы і фізіцы. Па выніках даследаванняў у 1990-1995 гадах апублікавана 4 манаграфіі. Прызнаннем узроўню дасягненняў у гэтай галіне з'явілася правядзенне на базе механіка-матэматычнага факультэта буйной міжнароднай канферэнцыі, прысвечанай акадэміку Ф.Д.Гахаву.

У рамках рэспубліканскай праграмы "Дыягностыка" на кафедры тэарэтычнай механікі і робататэхнікі распрацаваны праграмна-апаратны комплекс выяўлення позніх жалудачкавых патэнцыялаў сэрца па звестках усярэдненага электракардыясігналу. Яго выкарыстанне значна пашырае дыягнастычныя магчымасці ў кардыялогіі.

Найбольш значныя вынікі навукова-даследчай работы ФПМІ у 1995 годзе наступныя.

Распрацаваны падыход да пабудовы метадаў лічбавага мадэліравання дынамічных сістэм з хуткімі пераходнымі працэсамі, які не мае аналагаў у сусветнай вылічальнай практыцы (праф. Бабкоў У.В.). Закончаная пабудова якаснай тэорыі дыскрэтнай аптымізацыі на аснове матроіднага падыходу. Атрыманым вынікам прысвечаны спецыяльны нумар часопіса "Operations Research" (праф. Кавалёў М.М.). Прапанаваны матэматычны апарат, які дазваляе з агульных пазіцый даследаваць шырокі клас працэсаў перадачы інфармацыі ў тэлекамунікацыйных сетках (доктар фіз.-мат. навук Дудзін А.М.).

Вырашана пастаўленая больш за 40 гадоў таму задача аб ліку класаў спалучанасці спецыяльных матрычных груп (праф. Конюх У.С.). Даказаная вырашальнасць новага класа гранічных задачаў для дыферэнцыяльных ураўненняў з прыватнымі вытворнымі (праф. Карзюк В.І.). Факультэтам арганізаваныя і праведзеныя міжнародная канферэнцыя "Камп'ютэрны аналіз данных і мадэліраванне" і дзве рэспубліканскія канферэнцыі.

1 сакавіка 1996 года споўнілася 25 год з дня заснавання Навукова-даследчага інстытута прыкладных фізічных праблем імя А.Н.Сеўчанкі. Навуковыя даследаванні, навукова-тэхнічныя, доследна-канструктарскія і тэхналагічныя распрацоўкі праводзяцца ў інстытуце супрацоўнікамі 27 лабараторый, якія тэматычна аб'яднаныя ў 5 аддзелаў. Вынікі навуковых даследаванняў адлюстраваныя ў 81 манаграфіі і больш чым у 1200 артыкулах і іншых публікацыях. На рахунку супрацоўнікаў інстытута 6 Дзяржаўных прэмій і 3 прэміі Савета Міністраў.

Па выніках 1995 года можна сказаць наступнае. Распрацаваны і створаны на ўзроўні лепшых сусветных узораў 960-канальны камп'ютэрызаваны тэлеметрычны комплекс сейсмаразведкі, які забяспечвае значнае павышэнне эфектыўнасці пошуку нафты, газа і іншых карысных выкапняў. Створаны універсальны сонечны ультрафіялетавы спектраметр-азонаметр для вымярэння агульнага ўтрымання азону ў атмасферы і вырашэння іншых задачаў фізікі атмасферы. Праведзены шэраг параўнаўчых выпрабаванняў спектраметра-азонаметра з аналагічнымі прыборамі, што дзейнічаюць на станцыях сусветнай азонаметрычнай сеткі. У НДІ ПФП уведзеная ў доследную эксплуатацыю і прыступіла да рэгулярных назіранняў за станам атмасферы азонаметрычная станцыя. Распрацаваны метад выяўлення ачагоў запальвання лясных масіваў у інфрачырвоным дыяпазоне спектра. Створаная ўсечасовая, усепагодная аўтаматызаваная сістэма выяўлення ачагоў запальвання для пажарнага маніторынгу лясных масіваў, якая пераўзыходзіць па параметрах аналагічныя замежныя сістэмы. Выраблены, даследаваны і ўведзены ў эксплуатацыю ў РНТЦ "Экомир" трасавы спектраметрычны комплекс дыстанцыйнага вызначэння аптычных параметраў зямной паверхні.

У НДІ ядзерных праблем у 1995 годзе дадзена тэорыя новай фізічнай з'явы двайнога прамянепраламлення часціцаў большых энергій. Паказана, што гэтая з'ява дазваляе даследаваць узаемадзеянні часціцаў у шырокім спектры энергій аж да максімальна дасягальных у цяперашні час. Пачалася падрыхтоўка сумеснага беларуска-расійскага эксперыменту ў АІЯД (г.Дубна). Створаная эксперыментальная ўстаноўка для праверкі квантавай электрадынамікі. На аснове выказаных у НДІ ЯП ідэй распачалася падрыхтоўка найбольш адчувальнага эксперыменту па выяўленню неінварыянтнасці законаў прыроды адносна змены знака часу на аснове даследавання кручэння спіна атамаў у лазернай хвалі.

Паспяхова завяршылася пяцігадовая РНТП па стварэнню і выпуску апаратуры ў адпаведнасці з заданнямі Дзяржаўнай праграмы па пераадоленню наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС. З 47 заданняў выканана 41, 6 заданняў былі выключаныя з праграмы ў ходзе яе выканання. Прыборы, якія выпускаюцца ў НДІ ЯП у рамках РНТП 18.02р, забяспечваюць правядзенне як масавых радыяметрычных вымярэнняў, так і высокаадчувальных спектраметрычных вымярэнняў у спробах любой прыроды. Усе доследныя ўзоры створанай апаратуры прайшлі неабходную праверку ў Белстандарце, большая частка сертыфікаваная і ўключаная ў Дзяржаўны рэестр сродкаў вымярэнняў. На думку Нацыянальнай камісіі па радыяцыйнай абароне пры Кабінеце Міністраў РБ, распрацаваная па РНТП апаратура і метадычнае забеспячэнне дазваляюць правесці масавыя радыяцыйныя вымярэнні для ацэнкі радыяэкалагічнай сітуацыі ў рэспубліцы.У Маскве апублікаваная манаграфія У.Р.Барышэўскага "Ядзерная оптыка палярызаваных асяроддзяў".

Нацыянальным цэнтрам фізікі часціцаў і высокіх энергій пры БДУ апрабіраваны і ўкаранёны ў сістэму апрацоўкі данных фундаментальных эксперыментаў у навуковых цэнтрах Швейцарыі і Германіі каварыянтны метад разліку. Распрацаваны шэраг аналагавых і аналагава-лічбавых інтэгральных мікрасхемаў, адрознай адметнасцю якіх з'яўляецца спалучэнне рэкордналй адчувальнасці з хуткадзеянnем, высокая ступень інтэграцыі пры малым энергаспажыванні, а таксама магчымасць працаваць ва ўмовах магутнага і доўгатэрміновага радыяцыйнага ўплыву.

Кафедрай лазернай фізікі і спектраскапіі фізічнага факультэта адпрацаваная тэхналогія вырабу вадкакрысталічных (ВК) ячэек і распрацаваныя методыкі выкарыстання ВК-элементаў для стварэння крысталічных лінзаў з пераключальнай фокуснай адлегласцю. Упершыню атрыманыя і даследаваныя тэрмастойкія аморфныя пакрыцці на аснове сістэмы (Ti-Cr)N (кафедра цвёрдага цела). Вывучаныя структура і электрычныя ўласцівасці вугляродных плёнак з утрыманнем алмазнай фазы. Выраблены транзістарныя структуры на алмазе, якія вытрымліваюць высокія тэмпературы (кафедра фізікі цвёрдага цела, кафедра фізікі паўправаднікоў). Распрацаваная і ўкаранёная сістэма выяўлення і месцавызначэння лясных пажараў (кафедра ядзернай фізікі).

На факультэце радыёфізікі і электронікі распрацаваная тэхналогія стварэння звыштонкіх слаёў з кубічнага нітрыду бору і створаны прыбор для кантролю ўласцівасцей паверхні апрацоўваемых матэрыялаў; распрацаваная прылада ў выглядзе стандартнай платы персанальнага камп'ютэра, якое ператварае апошні ў асцылограф, і створанае праграмнае забеспячэнне для кіравання гэтай прыладай; створаная шматфункцыянальная лазерная медыцынская станцыя і прылада для пошуку актыўных кропак пры лазернай акупунктуры.

Навукоўцамі хімічнага факультэта і НДІ ФХП знойдзеныя прынцыпова новыя падыходы да стварэння эфектыўных каталізатараў, звышправадных керамічных матэрыялаў, аксідных матэрыялаў з высокай іённай і электроннай праводнасцю, каразійнастойкіх пакрыццяў, хімічных газавых сенсараў для выяўлення і кантролю выбухованебяспечных і таксічных рэчываў у паветраным асяроддзі, вогнегасільных рэчываў, іённаабменнікаў, высокатэмпературных топліўных элементаў, інгібітараў свабоднарадыкальных працэсаў, прагнозных радыяэкалагічных картаў, электроднаактыўных матэрыялаў. Распрацаваныя простыя метады аналізу прымясных іённаў у пітной вадзе, вырабленыя наборы рэагентаў для клінічнай дыягностыкі, прыборы для экспрэс-аналізу следавых колькасцяей цяжкіх металаў. Створаная база тэрмадынамічных данных па вытворчасці шэрага прамыслова важных арганічных рэчываў. Абаснаваныя тэхналогіі вытворчасці дызельнага паліва (біягаза) і напрацаваная доследная партыя такога паліва з рапсавага алею. Прапанаваная арыгінальная схема атрымання ёда-бромнага канцэнтрату з солевых расолаў Прыпяцкага прагібу.

Работы, якія на працягу шэрага год вяліся пад кіраўніцтвам прафесара Кулінковіча А.Г. прывялі да адкрыцця новай рэакцыі (прыярытэт адкрыцця пацверджаны ў публікацыях вядомых навукоўцаў ЗША, Расіі, Германіі, Японіі). Рэакцыя Кулінковіча істотна пашырае магчымасці выкарыстання магнійарганічных рэагентаў у тонкім арганічным сінтэзе.

Распрацоўкі, давёдзеныя да выпуску серыйнай прадукцыі ў 1995 годзе:

— на Барысаўскім заводзе медпрэпаратаў арганізаваная вытворчасць акісленай цэлюлозы і медыцынскіх прэпаратаў на яе аснове — крываспыняльнага сродку "полікапран" і плёнкі лекавай з лінкаміцынам;

— выпрабаваная і рэалізаваная першая прамысловая партыя праяўніка "Рэнтген-М", які дазваляе знізіць промневую нагрузку на пацыентаў пры рэнтгенадыягностыцы ў 5-8 разоў;

— засвоеная прамысловая вытворчасць залатых пакрыццяў для тэлефонных крэдытных картак;

— распрацаваныя і засвоеныя тэхналогіі вытворчасці шэрага вырабаў з каштоўных металаў для патрэбаў прадпрыемстваў РБ, уключаючы кантакты, аноды, дрот рознага дыяметру і іншае;

— арганізаваная вытворчасць клею магутнасцю 350 тон у год на аснове адкідаў вытворчасці ВА "Палімір";

— на базе распрацовак інстытута арганізаваная вытворчасць фільтраў для ачысткі вадкасцяў прамысловага і бытавога прызначэння.

У навукова-інжынерным цэнтры завершаны шэраг працаў, якія выконваліся па распрацоўках кафедраў, што дазваляе перайсці да дробнасерыйнай і нават серыйнай вытворчасці ці прамысловага выкарыстання тэхналагічных працэсаў. Да такіх распрацовак адносяцца плазменныя тэхналогіі мадыфікацыі паверхні, электрахімічныя метады зняцця каштоўных металаў з металічных паверхняў, прыбор для ацэнкі фізічнай працаздольнасці чалавека, графічны сапрацэсар, ЭКГ-тапограф. Частка распрацовак прадстаўленая на выставе.

Супрацоўнікамі біялагічнага факультэта на аснове глебавых бактэрый распрацаваны новы біяпрэпарат "Бактафіл" для абароны раслін. Упершыню для гэтых бактэрый створана сістэма генетычнага аналізу, здзейснена картаванне генаў біясінтэзу араматычных злучэнняў і вывучаны генетычныя механізмы іх сінтэзу. Распрацаваныя генна-інжынерныя падыходы для канструявання прадуцэнтаў гэтых злучэнняў. Вывучаныя асноўныя мембранныя механізмы паглынання іёнаў раслінай клеткай і іх рэгуляцыя. Выяўлена, што за кошт мадыфікацыі гэтых механізмаў знешнімі ўплывамі расліна можа змяняць накапленне радыянуклідаў у межах двух парадкаў.

Высветлены састаў фауны лістаедаў СНД і напісаны вызначальнік відаў, гатовы да публікацыі. Завершанае вывучэнне флоры паўднёва-усходняй часткі Мінскай вобласці, а таксама вывучаны відавы састаў фітапатагенных грыбоў. З іх 55 відаў з'яўляюцца новымі для рэспублікі. Вызначаныя найбольш шырока распаўсюджаныя і рэдкія, патэнцыйна небяспечныя віды фітапатагенных грыбоў.

Агульнаўніверсітэцкай кафедрай медыцынскай падрыхтоўкі распрацаваная методыка і прыстасаванне для вызначэння анамаліі рэфракцыі зроку і ейнай карэкцыі. Праведзеныя клінічныя выпрабаванні прыстасавання. Супрацоўнікі кафедры Фёдараў Ю.Г. і Фралоў Л.А. сталі аўтарамі першага ў БДУ патэнта РБ.

(Заканчэнне ў наступным нумары.)

No smocking !

31 мая -- Дзень барацьбы з курэннем

Кураць практычна ўсе: рабочыя і манекеншчыцы, студэнты і пенсіянеры, ахоўнікі парадку і злачынцы, спартсмены і, тым больш, хто спортам ніколі не займаўся. Свет падзяліўся на дзве часткі: тых, хто курыць, і тых, хто ўжо кінуў. Тых жа, хто не пачынаў, аднеслі да атраду выміраючых і прымусілі ўоё жыццё змагацца за выжыванне. Усе філасофскія пытанні сцёрліся перад больш глабальным: курыць ці не курыць? А фразы кшталту "Скажы, што ты курыш, і я скажу, хто ты" гучаць сёння больш жыццёва, чым усе правілы матэматыкі, законы фізікі і Кодэкс законаў аб працы разам узятыя. Змагацца з курэннем — значыць змагацца з самім сабой, бо без курэння мы сябе ўжо не ўяўляем. Яно ўвайшло ў звычку, а звычка, як вядома, другая натура, другое "я".

Невялікае прэс-апытанне, праведзенае сярод студэнтаў універсітэта напярэдадні дня барацьбы з курэннем, не ставіла перад сабой мэтай стварэнне душашчымлівага маралітэ. Гэта была толькі спроба паглядзець на сябе збоку. (Прычым многія адказы былі настолькі падобныя, што няма сэнсу ўказваць прозвішчы.)

— Курыць пачала яшчэ ў школе. Мама, канешне, не ведала. Аднойчы яна знайшла ў маім паліто запальнічку, давялося выдумляць, што адабрала яе ў хлопцаў на ўроку. Здаецца, паверыла,— прызналася пафарбаваная бландзінка, хутчэй за ўсё першакурсніца.

Але гэта не правіла. Пераважная большасць студэнтаў пачынае курыць менавіта стаўшы студэнтамі. Асабліва гэта датычыцца тых, хто прыязджае з перыферыі. Інтэрнат вызваляе іх ад апёкі бацькоў і настаўнікаў і кідае пад непасрэднае ўздзеянне "аўтарытэтаў". Кураць "за кампанію": маўляў, і мы, валожынскія, не лыкам шытыя. А потым многія з іх кожны тыдзень кідаюць курыць, кожны месяц абяцаюць гэта сваім бацькам і кожны дзень бегаюць да камерцыйнай крамы.

Але сустракаюцца і больш-менш выніковыя спробы:

— Гады тры ўжо не куру. Лічу, што гэта перашкаджае заняткам спортам і здароўю. Хаця, напрыклад, дзевяностагадовая бабуля смаліць адну цыгарку за другой і на здароўе не скардзіцца. Відаць, ад арганізма ўсё залежыць.

— Я таксама кінуў курыць,— *падтрымаў спартсмена сябра,*— але, калі збіраецца вялікая кампанія, то адмовіцца цяжка. Апошні раз накурыўся на вечары сустрэчы выпускнікоў, ды так, што дагэтуль на цыгарэты глядзець не магу.

Давялося выслухаць і такія шчыраванні:

—Я спрабавала курыць, але не атрымала ніякага задавальнення. І не разумею, што ў гэтым знаходзяць астатнія. На маю думку, лепей выпіць кубак добрага віна.

Напэўна, з гэтай прадстаўніцай цудоўнай паловы чалавецтва трэба будзе сустрэцца напярэдадні дня барацьбы з п'янствам, калі такі ёсць.

Але больш тыповымі былі наступныя адказы:

—Пастаянна куру ўжо чатыры гады. Першую цыгарэту выкурыў гадоў у трынаццаць. Разам з сябрамі рабілі гэта на школьным двары, але так, каб ніхто не бачыў. Потым неяк цяга да "экзотыкі" ў выглядзе хавання па завуголлях, каб пакурыць, прайшла. І калі паспрабаваў зноў, "па-дарасламу", кінуць не змог.

— Здараецца, у дзень выкурваю пачак цыгарэт. Кінуць? Не, не спрабаваў, хаця мая дзяўчына на гэтым настойвае.

Не трэба глыбокіх матэматычных ведаў, каб падлічыць, у колькі абыходзяцца гэткія штодзённыя "злоўжыванні". Прыкладна — стыпендыя. "Курыць... Вось лозунг мой"? А есці, піць, апранацца, дзяўчыне шакаладку купіць, у рэшце рэшт?

Прасвяціў студэнт-хімік:

— Мне, напрыклад, бацькі даюць грошы кожны месяц, а дылема, што купіць: бохан хлеба ці пачак цыгарэт — заўсёды вырашаецца на карысць апошняга, нават калі ў кашальку застаецца ўсяго некалькі тысяч.

Дзяўчынкі інтэрната № 2, запаўняючы ліфцёрку табачным дымам, доўга распавядалі аб прычынах сваёй схільнасці да цыгарэт, што коратка гучыць прыкладна так: "Куру, таму што куру".

Падчас праведзенага апытання ўсё ж давялося пазнаёміцца з дзяўчынай, якая ніколі не трымала цыгарэты ў руках, але яна аказалася прыхільніцай... дыму ментолавых цыгарэт. Вось так.

Вынікі падвесці няцяжка. Кураць студэнты нягледзячы на малыя памеры стыпендый і высокі курс даляра, на папярэджанні Міністэрства аховы здароўя і просьбы бацькоў, на парламенцкія сесіі і на свае ўласныя. Магчыма, курэнне ўжо не проста звычка, гэта — вобраз мыслення. А таму і сродкі барацьбы павінны быць іншымі, бо яго нельга знішчыць,

яго можна замяніць. Як і чым — пытанні, на якія і трэба шукаць адказ.

Алёна Шаўкун

Настаўнікаў баяцца — у школу не хадзіць

Замалёўка

Нарэшце, звініць званок на ўрок, які мала хто з вучняў хацеў бы пачуць, і шумны натоўп пачынае паволі разыходзіцца са школьнага калідора па сваіх класах.

У нашым класе зараз — урок гісторыі. Выкладчык чамусьці затрымліваецца, і гэтая акалічнасць выклікае радаснае ажыўленне. Нехта з "троечнікаў" выказвае ўслых меркаванне, нібы гісторык захварэў ці зламаўся па дарозе аўтобус, на якім той ехаў у школу.

Але постаць настаўніка, якая з'яўляецца на парозе, цалкам разбурае гэтыя надзеі. Суровы позірк Васіля Іванавіча з-пад акуляраў, які, здаецца, ахоплівае ўвесь клас і бачыць кожнага паасобку, не прадвяшчае нічога прыемнага.

Нярвовы смяшок на задняй парце парушыў змрочную цішыню, але імгненна змоўк. Кожны адчувае нярвовае напружанне. Мне (я сяджу на перадапошняй парце) добра відаць, як некаторыя аднакласнікі пад позіркам выкладчыка ціха з'язджаюць з крэслаў уніз, імкнучыся зрабіцца як мага меней прыкметнымі. Урэшце з-за партаў відаць толькі іх галовы — ніжэй спаўзаць няма куды.

Іншыя школьнікі наганяюць на твар сур'ёзны выраз і з выглядам дасведчаных знаўцаў гартаюць падручнік.

І вось кульмінацыйны момант уроку — настаўнік падыходзіць да стала і адкрывае класны журнал! Агульнае хваляванне дасягае апагею.

Тыя, хто сядзяць за першымі партамі, затаіўшы подых, сочаць — над якім прозвішчам спыніцца асадка, якой Васіль Іванавіч вядзе па журналу. На вастрыні гэтай асадкі зараз сканцэнтравалася ўвага ўсіх вучняў. Тыя, каму выпала сядзець з выдатнікамі за адной партай, штурхаюць суседзяў у бок і грозным шэптам моляць іх падняць руку, "выклікаць агонь на сябе". Астатнія сутаргава, праз радок, чытаюць зададзены параграф.

Нарэшце, гучыць прозвішча няшчаснага, які вінен адказаць дамашняе заданне. Па класу праносіцца ўздых палёгкі. Атмасфера разраджаецца. У многіх мільганула думка, што жыццё — не такая ўжо і кепская рэч!

Ва ўсіх, за выключэннем настаўніка і вучня, які адказвае, знікае ўсялякая цікавасць да ўрока. Мая суседка фарбуе ногці і пераконвае, што гэты лак прыгажэйшы за набыты ёю на мінулым тыдні.

Ззаду чуваць стрыманыя выгукі ды яхідны смех — хлопцы з захапленнем гуляюць у карты. Тым часам выкладчык, выслухаўшы адказ, пачынае сам распавядаць пра рэвалюцыйную сітуацыю ў Расіі напярэдадні 1917 года.

Незнарок зірнуўшы ўлева, я ледзь стрымалася ад смеху. Мая сяброўка, якая лічыць сябе нефармалам і аматарам "цяжкай" музыкі, сядзіць у навушніках з плэерам у руках і нічога не заўважае вакол сябе. Відаць, у гэты момант гучыць нейкая з яе любімых кампазіцый, бо на твары дзяўчыны з'яўляецца гама пачуццяў, яна крыху прыскоквае і спрабуе падпяваць.

Яе суседка па парце штурхае "нефармалку" локцем — каб цішэй спявала. Сціплы "троечнік" сумна назірае за імі са свайго надзейнага прытулку — апошняй парты і, зрэдку пазяхаючы, сочыць за палётам птушак за вокнамі. Ягоны сусед таксама не вызначаецца поспехамі ў вучобе, але марыць паступіць у мастацкае вучылішча і таму натхнёна малюе на парце алоўкам чарговы шэдэўр. Аднакласніца з правага боку ад мяне, кідаючы стомлены позірк на гадзіннік на руцэ, паўтарае напамяць верш Якуба Коласа, бо наступны ўрок — беларуская літаратура.

Тым часам, выкладчык заўважыў, што, аказваецца, яго тлумачэнняў амаль ніхто не слухае. Нельга сказаць, каб яго асабліва парадавала гэтае адкрыццё. Але нас ужо не запалохаеш "двойкамі" і выклікамі да дошкі, бо да доўгачаканага званка засталося менеш дзвюх хвілін! Настаўнікаў баяцца — у школу не хадзіць!

Нарэшце, гучыць званок, які абвяшчае дзесяць хвілін свабоды. Падчас перапынку можна паспець столькі зрабіць: схадзіць у сталовую, спісаць у суседкі дамашняе заданне, наведаць сяброўак з паралельнага класа і даведацца, як яны бавілі час на ўроку!

І не хочацца думаць пра тое, што праз дзесяць хвілін свабода скончыцца. Пачнецца новы ўрок — і ўсё паўторыцца. І з такіх ці падобных урокаў складаецца наша вучоба. Наўрад ці хто з нас здолее дакладна адказаць, чаму ў школе так сумна вучыцца? Ці толькі школьнікі вінаватыя, што не прагнуць авалодаць ведамі, ад якіх у "дарослым" жыцці часам не надта карысці? Ці, можа, сістэма адукацыі спецыяльна зладжана такім чынам, каб у школе было нецікава вучыцца? Ці, можа, нам усім не пашанцавала нарадзіцца ў той час, калі падлеткі з ахвотаю крочылі на заняткі? Ці, можа, ніякіх сацыяльных праблем няма, а ёсць толькі праблемы "крытычнага ўзросту" 16-17 гадоў?

Хто ведае? Хто адкажа?

Наталля Сарока,
вучаніца 11-га
класа СШ № 69
г.Мінска

Таня Бельчык сёлета скончвае 9-ы клас, марыць стаць журналісткай. Любімы занятак — маляванне. Аднак свае ўражанні Таня перадае не толькі фарбамі, але і занатоўвае іх. А сёння вырашыла падзяліцца сваімі ўражаннямі з намі.

Пад вакном пасадзілі ліпу...

Аксамітны вечар дыхаў свежасцю, чысцінёй. Да экзаменаў засталося дзён пяць. Цвіў апошні бэз. Лёгкі вецер адносіў сум. Змрок апускаўся на горад.

На стале ляжаў раскрыты падручнік, на 60-й старонцы, на тэарэме Фалеса. Вакно было расчынена, і ў пакой разам з шумам аўтамабіляў урываўся вячэрні пяшчотны звон.

Успаміналася чамусьці дзяцінства. Ранішні прамень сонца ў бабуліным пакоі, пучок радыскі, варэнне з дзьмухаўцоў, зламаны кімсьці каштан, яркія цюльпаны. І стары хлеў, завалены рыззём і мінулагоднімі газетамі, пыльнае і заўсёды зманлівае і таямнічае гарышча, доўгая лесвіца, якая вяла на другі паверх, дзе стаяў стары пісьмовы стол і адпачываў лянівы кот Валяр'ян.

Потым па бярвёнах разабраны дом, гружаныя рэчамі машыны. Вартыя жалю астаткі замест дома, вытаптаныя кветкі, ссечаны сад. І праз год на месцы ўтульных домікаў бязлікія скрынкі.

Новая кватэра ў дзевяціпавярхоўцы, чужыя суседзі, вузкі калідор, маленькія пакойчыкі. Звыкліся... Пад акном пасадзілі ліпу. Нехай цвіце кожнае лета!

Год назад у сям'і стала незвычайна спакойна. Памятаю, вечарам ішлі па дваравому стадыёнчыку. Быў май, і ў паветры вісеў пах кветак. "Люблю вясну," — сказаў тата. Ён быў ужо хворы. Праз месяц яго не стала. Потым імклівa пранёсся год, не пакінуўшы ў памяці аб сабе нічога, акрамя частых слёз і знаёмага партрэта за шклом. З часам боль сціхае. Застаецца святое — памяць.

На стале гарэла лямпа. Яна перашкаджала спакойнаму адзіноцтву. Давялося адарвацца і выключыць яе. На вячэрнім небе ўзышлі зоркі. Недзе пачуўся смех, абрыўкі знаёмай песні. Стаяла цёплая мяккая ноч. Падручнік заставаўся на той жа старонцы. Але здавалася ў гэтую спакойную ноч, што ўсё дрэннае ўжо ззаду, а наперадзе — радаснае, галавакружнае юнацтва.

1 чэрвеня — Дзень абароны дзяцей...і сабак

Я мару аб тым, каб хто-небудзь прыдумаў сур'ёзна абараняць сабак. Бо так шкада іх, бяздомных. У нашым двары жыве сімпатычны пёс — я яго назвала Малышом. Ён зусім малады, месяцаў 10-11. Ласкавы і разумнік. Кожную раніцу, выгульваючы сваю Дзінку, выношу яму крыху ежы: вы б пабачылі, як Малыш радуецца. Ён гатовы аддзячыць мне з ног да галавы, гэта значыць — аблізаць. А якія ў яго вочы! Глядзіць, як усё адно пра нешта пытае. Кепска сабаку без гаспадара. У мяне проста сэрца разрываецца: другога сабаку ўзяць у дом няма ніякай магчымасці.

А Дзінка наша сваіх гаспадароў выбрала сама. Гэта было на дачы: да нас прыбег калматы белы сабачка і забраўся пад машыну. Ляжыць сабе, маўчыць, адпачывае, значыць. А нам ехаць трэба. Ледзь угаварылі вылезці: і сігналілі, і бутэрброд прапанавалі. Ну, і канешне ж, узялі з сабой. Вельмі ўжо сур'ёзным падаўся нам гэты сабака.

А нядаўна бачыла, як у скверы гаспадар натравіў свайго дабермана на бяздомную дварняжку. Дабермана хрыпеў, рычаў, жадаючы разарваць яе. Але дварняжка ўцякла і ў пошуках ратавання кінулася ў ногі нейкай жанчыне. Забілася, ціхёнечка заскуголіла. З разарванага бока цякла кроў. Гэтая жанчына ўзяла сабе дварняжку, назвала Кімам. Цяпер я часта сустракаю іх у час вечаровай прагулкі. Кім — самы неўгамонны, самы жвавы сабачка з маіх чацвералапых сяброў.

Я з болем думаю аб бяздомных сабаках, якія бадзяюцца па нашаму гораду. Адных выкідаюць гаспадары, бо яны не пародзістыя, другія губляюцца, трэція ўжо нараджаюцца бяздомнымі. Яны трапляюць пад машыны, іх пінаюць нагамі, яны крадуць булачкі з латкоў. Яны баяцца людзей. І адначасова просяць у іх дапамогі. І мне здаецца, што гэта мы вінаватыя перад нашымі малодшымі братамі. Калі мы жорсткія ў дачыненні адзін да аднаго, то наўрад ці будзем дабрэйшымі да жывёлаў.

Наша здароўе

Надзейная засцярога

Грамадскае стаўленне да рэгулявання зачацця нават у нашым адукаваным грамадстве не з'яўляецца нечым само сабой зразумелым. Адзін з самых распаўсюджаных метадаў кантрацэпцыі — гармональная ці аральная кантрацэпцыя (АК). Але нярэдка назіраецца негатыўнае стаўленне да АК. Збольшага — праз недахоп інфармацыі. Які механізм іх дзеяння, магчымыя пабочныя рэакцыі, карысць і рызыка ўжывання? З гэтымі і іншымі пытаннямі я звярнулася да доктара-гінеколага 33-й гарадской студэнцкай паліклінікі Лідзіі Васільеўны Глазавай.

— За 30 гадоў, якія прамінулі з моманту выпуску першых процізачаткавых таблетак, ва ўсім свеце яны сталі найбольш надзейным метадам прадухіленне зачацця. Дзякуючы гэтаму скараціўся лік абортаў: калі ў 1994 годзе ў нас было зроблена 226 абортаў, то ў 1995 — 159.

— Што неабходна ўлічваць пры прыёме процізачаткавых таблетак?

— Рэкамендацыі, якія ідуць ніжэй, дапамогуць жанчыне пазбегнуць памылак і даверыцца дзеянню таблетак:

1. Мэтазгодна прымаць таблеткі ў адзін і той жа час.

2. Надзейная засцярога ад цяжарнасці забяспечваецца як у час паўзы, так і ў перыяд прыёму дражэ, свабодных ад актыўных рэчываў.

3. Перад пачаткам прыёму таблетак кожнай жанчыне неабходна прайсці гінекалагічнае абследаванне.

— Якое пабочнае ўздзеянне процізачаткавых таблетак?

— Большасць добра пераносіць гэтыя таблеткі. Да нязначных пабочных уздзеянняў (асабліва ў пачатковай стадыі прыёму) можна аднесці лёгкую млоснасць, пачуццё напружання ў грудзях, што знікае часцей за ўсё пасля некалькіх цыклаў прыёму.

— У якіх выпадках не варта прымаць гэтыя сродкі?

— Таблеткі супроцьпаказаныя пры цяжарнасці, пры цяжкіх парушэннях функцыі пячонкі, пры жаўтусе, раку малочнай залозы, дыябеце, парушэнні тлушчавага абмену і інш.

— З якога ўзросту дзяўчыне можна прымаць процізачаткавыя таблеткі?

— Гэтае пытанне толькі часткова адносіцца да медыцыны. Дзяўчыне, якая мае партнёра, у любым разе варта параіцца з доктарам. У цяперашні час перавага аддаецца таблеткам з як мага больш нізкім утрыманнем гармонаў. Яны вызначаюцца кантролем цыкла і мінімальнай нагрузкай на арганізм.

Не саромцеся, прыходзьце да нас на кансультацыі: мы дапаможам вырашыць вашы праблемы.

Аксана Шыкуць

Хто да нас з мячом прыйдзе...

Набліжэнне сесіі, няспынная спёка, а потым холад, "як на марскім дне", пранізлівы вецер і нават дождж — усё, здаецца, было супроць чэмпіянату па футболу сярод факультэтаў БДУ, але ён усё-такі адбыўся. Распавядаць падрабязна аб папярэдніх спаборніцтвах я не буду. Скажу толькі, што ўсе факультэты былі падзеленыя на 4 падгрупы па 3 каманды кожная, 4 пераможцы ў той жа кругавой сістэме разыгралі паміж сабой вышэйшыя ступені. Нечакана за бортам фінальных спаборніцтваў апынуўся ФПМ, які "падвяла" розніца забітых і прапушчаных мячоў. Хацелася б таксама адзначыць каманду фізікаў, касцяк якой складаюць пяцікурснікі. На полі яны выглядалі годна і былі ў паўкроку ад фіналу. А вось біёлагі не парадавалі, але і не здзівілі: дзве гульні — і дзве няяўкі. А назіраць мы будзем за юрыстамі, географамі, радыёфізікамі і мехматаўцамі. Для пачатку прыгледзімся да іх больш уважліва.

У кожнай каманды ёсць людзі, па якіх яе пазнаюць. Пры з'яўленні камерунцаў вочы самі шукаюць Ражэ Міла, а ў саставе галандцаў позірк амаль адразу ж спыняецца на Рууце Гуліце. Так званыя "візітоўкі" ёсць і на геафаку, і сярод юрыстаў.

Варатар географаў, Віця Толмач, запамінаецца адразу, усім.і надоўга: сярэдняга росту, вельмі магутны, на першы погляд можа здацца, што ў геафака праблемы з галкіперамі і паставілі здаравейшага. Аднак пры першым жа скачку разумееш, што перад табой сапраўдны варатар.

— Віця, як ты стаў варатаром?

— Наш варатар вучыцца на 5 курсе, а ў іх, сама ведаеш, які зараз час. Так я і стаў. Ды мне не прывыкаць. Увосень стаяў у "рамцы" на міні-футболе і лічуся штатным ахоўнікам варот у зборнай геафака па тому ж міні.

— Але крыху дзіўна бачыць цябе ў варотах.

— У полі ў мяне бегаць не атрымліваецца, не шпаркі я ўвогуле. А на рэакцыю ніколі не скардзіўся, дый скакучасць яшчэ, цьху-цьху, не падводзіла.

— Але варатарам часам даводзіцца кідацца ў ногі нападаючым. Як тут?

— Ды на варотах можна і не разганяцца. Галоўнае — мячык не губляць з поля зроку. А на апярэджанне гуляць лёгка: маленькі рывок, крык "Рукі ўгору" — і ўся гульня.

— Калі я не памыляюся, ты адзіны варатар у гэтай фінальнай серыі, які падказвае сваім таварышам.

— Што ж гэта за варатар без голасу? Гэта ж нельга такое. Павінен нехта кіраваць гульнёй? Хлопцы ж могуць памыліцца, спіной яны не бачаць. А я апошні, мне ўсё відаць.

— І літаральна пару слоў, што ўяўляе з сябе Віця Толмач па-за полем.

— Студэнта 1-га курса геафака з сябе ўяўляю. Праўда, год вывучаў хімію, але яна мне хутка надакучыла, а геаграфія вабіла заўсёды. Вучуся амаль выдатна, праўда-праўда. Але чытаць не люблю, затое хакей, баскетбол і наогул спорт проста абажаю.

Дыспетчара юрыстаў, Шалву Гегелія, я заўважыла перад гульнёй з журналістамі. Ён размінаўся асобна ад каманды і, калі можна так сказаць, прафесійна. Спярша я абвінаваціла ў гэтым свой жаночы погляд, але ўсе мае апасенні развеяў сам Шалва. Пачаў гульню асцярожна, нібы прыглядаючыся да суперніка. А потым пачаў тварыць дзівы. У другім тайме ён абвясціў аб пачатку разгрому маіх калег: варатар здзівіўся не самому ўдару, а дзёрзкасці Шалвы (з далёкіх дыстанцый білі рэдка, а нізам — адзінкі). Журналісты паспрабавалі выключыць яго з гульні, але хутка зразумелі, што не могуць, махнулі рукой, прадаставіўшы яму поўную свабоду дзеянняў. А Шалва, пакінуты супернікамі, без цяжкасці прыводзіў у дзеянне адладжаную машыну юрфака.

Мехмат — каманда даволі цікавая, ад яе можна чакаць любых сюрпрызаў, але хлопцам не хапае вопыту і зладжанасці. То саб'юцца гуртам у цэнтры поля, то зблытаюць свае пазіцыі так, што левы абаронца апынецца на месцы правага нападаючага, то выйграючы не змогуць патрымаць мяч. Але каманда — на ўздыме, запасу задзёру хопіць надоўга.

Радыёфізікі адносяцца да тых камандаў, дэвіз якіх "Хай не зусім добра згуляем у нападзенні, але жорстка ў абароне". Іншымі словамі, збалансаванай лініі атакі суперніка мусіць супроцьстаяць не менш збалансаваная абарона радыёфізікаў.

Калі гаварыць аб прагнозах, то фаварытамі турніра лічыліся географы, чэмпіёны мінулага года, і юрысты, самая зладжаная каманда. Але ніхто і ніколі не скідаў з рахункаў ні мехматаўцаў, ні радыёфізікаў.

Такім чынам, памяняўшы поле ў Шчомысліцы (а адборачныя гульні праходзілі менавіта там) на дзьмухаўцовую паляну з выдатнай разметкай (добра, што траву скасіць паспелі) мінскага стадыёна "Узлёт", першымі выйшлі "высвятляць адносіны" мехматаўцы і географы.

Напачатку быў хаос. Хаос быў і напрыканцы. Вось кароткі змест двух таймаў. Абедзве каманды рухаліся шмат, але гэта больш падобна было да руху малекул, чым да арганізаваных дзеянняў. Футбалісты штурхаліся ў цэнтры, абсалютна не выкарыстоўваючы флангі. Сярод гэтай мітусні выдзяляўся мехматавец Міхаіл Лукашэвіч. Здавалася, ён паспяваў паўсюль. Вынік — пасля розыгрышу штрафнога паследаваў навес у штрафную, і Андрэй Сёмухаў запхнуў мяч у сетку варот. Географы спярша разгубіліся, а потым пачалі псаваць нервы мехматаўцам: удар Валерыя Емяльяненкі быў вышэй варот, а Віталь Гештань двойчы не змог прабіць варатара, Паўла Ільіна.

Пачатак другога тайма географы адзначылі голам. У адказ была доўгая перадача за спіны абаронцаў, і Дзіма Кадакоў прымусіў супернікаў пачаць з цэнтра. Далей гульня развівалася па сцэнарыю першага тайма. Кадакоў і Гештань усё гэтак жа сама калупалі абарону мехматаўцаў, а Лукашэвіч спрабаваў распужаць географаў. Можа, так усё і скончылася б, калі б у самым канцы матча нехта з абаронцаў геафака не паспрабаваў вынесці мяч са сваёй варатарскай, які трапіў у спіну Алега Бялова і заляцеў у вароты. Аднак апошняе слова сказаў усё-такі Дзмітрый Кадакоў, які забіў з развароту мяч у правы ад варатара вугал. Такім чынам, 2:2.

У юрфака непрыемнасці пачаліся яшчэ да свістка, калі хлопцы даведаліся, што асноўнага іх варатара вывела з бою Шалва Гегелія, які нямала зрабіў у папярэднім матчы для разгрому журналістаў (0:6). Недалёка ад яго сышоў і Павел Лутовіч, які толькі двойчы папалохаў галкіпера радыёфізікаў дальнімі ўдарамі, але абодва разы выстралы давяліся па вераб'ях. Яшчэ адзін лідэр юрыстаў, Аляксей Кароль, памылкова нацягнуў на ногі боты-скараходы: ён перабегаў усіх, але, на жаль, на большае і яго ў той дзень не хапіла.

Кульмінацыяй у матчы стала выдаленне за абразу суддзі аднаго з радыёфізікаў. Але хлопец, які не адчуваў за сабой віны, катэгарычна адмовіўся сыходзіць, абвінавачваючы пры гэтым суддзю ў прадузятым стаўленні да юрыстаў. Поле ён усё-такі пакінуў, але пасля свістка арбітра, які сведчыў аб тэхнічным паражэнні радыёфізікаў. У гэты час на полі стала менш на аднаго чалавека, а суддзя даў сігнал да працягу матча. Аднак да канца гульні чуліся абразы ў бок суддзі, заклікі да радыёфізікаў байкатаваць матч. цягнуць час, гуляць толькі "на адбой", біць па нагах супернікаў.

Пасля ўзнаўлення гульні складася ўражанне, што каманды глынулі па пачку "Азвярыну", але на радыёфізікаў яго ўплыў спыніўся праз некалькі хвілін, а юрысты ціснулі і ціснулі супернікаў. Шалва Гегелія і Паша Лутовіч закідалі партнёраў мячамі, але ў адладжанай машыне юрфака штосьці дало збой. Здавалася, яшчэ б крыху падпружыцца — і радыёфізікі выкінуць белы сцяг, але фінальны свісток абвясціў аб нулях у пратаколе.

Пасля гульні шмат хто задаваўся пытаннем: ці былі правамоцнымі дзеянні арбітра? Я папрасіла пракаментаваць гэты эпізод галоўнага суддзю чэмпіяната Беларусі Юрыя Савіцкага:

— Футбаліст абразіў суддзю, і суддзя меў рацыю, калі папрасіў яго пакінуць поле. Калі ж той адмаўляецца гэта зрабіць, то суддзя мае права спыніць матч датэрмінова. А потым павінна збірацца судзейская калегія універсітэта, дзе было б вынесена рашэнне па гэтаму пытанню. Магчымыя варыянты: пераігроўка, тэхнічнае паражэнне ці наогул дыскваліфікацыя каманды. Але ёсць нягласнае правіла ўсіх суддзяў: пры любых умовах паспрабаваць давесці матч да канца. Таму нават калі арбітр даў фінальны свісток, але бачыць, што футбаліст яму падпарадкаваўся, як было ў гэтым выпадку, суддзя мае права працягнуць матч.

І на другі дзень хлопцы крыўдзіць адзін аднаго не захацелі. Абодва матчы скончыліся нічыёй: географы падзялілі ачкі з радыёфізікамі (2:2), а юрысты мірна разышліся з мехматам (1:1).

Юрысты нечакана для ўсіх апынуліся чацвёртымі. Адступаць ім не было куды, і, думаю, настрой у іх быў такі ж, як у салдатаў пад Масквой у 41-м. Географы, маючы тутул чэмпіёнаў, "забівалу" Кадакова і лепшы паказчык па забітых мячах, маглі лічыць справу зробленай і паспрабаваць "закідаць шапкамі" юрыстаў. Пасля дзвюх шчаслівых гульняў супроць лідэраў мехмат, натуральна, магло ахапіць жаданне папсаваць рэпутацыю радыёфізікам. А тыя таксама былі не супраць пакрасавацца на першай прыступцы п'едэстала.

Першая кроў на турніры пралілася ў матчы мехмата з радыёфізікамі, калі ў запале барацьбы некаму з мехматаўцаў разбілі каленам нос. Але гэта было напрыканцы матча, а ў пачатку гульня праходзіла вельмі вяла, у асноўным — у цэнтры поля і каля варот мехматаўцаў. На адзінаццатай хвіліне Уладзіслаў Цегін забіў гол пасля праходу па праваму флангу. Мяч, паскакаўшы па кочках, застраў у лужы і заплыў у вароты. Мехматаўцы змаглі адгуляцца толькі ў другім тайме. Пасля перадачы з цэнтра поля Толя Хаменка паслаў мяч над варатаром, які хлопаў вушамі. Былі моманты і ў радыёфізікаў, але ў адным выпадку мяч выпхнуў з лініі варот Міша Лукашэвіч, а ў другім — паскнарнічаў напрадаючы, але Улад Цегін пасля падачы вуглавога паставіў кропку — 2:1. Перамога — за радыёфізікамі.

Пасля гульні трэнер мехматаўцаў Сяргей Літвінаў так ацаніў сваю каманду: "Моцна згулялі, малайцы. Калі параўноўваць з мінулым годам, то мы былі пятымі, а зараз трэція або чацвёртыя. Усё залежыць ад юрыстаў".

Перад апошнім матчам усе лічылі, які лік каго задаволіць. Юрыстам, каб стаць чэмпіёнамі, трэба выйграць з розніцай у 2 мячы, гэтых жа 2 мячоў дастаткова мехмату, каб стаць трэцімі. Радыёфізікаў задавальняла нічыя з палюбоўным лікам ці мінімальная перавага юрыстаў. Географам хапіла б закаціць адзін безадказны мяч.

Гульня пачалася з разведкі, але доўга цацкацца юрысты не захацелі. Правёўшы некалькі атак, яны зрабілі лік 2:0 на сваю карысць. Юрысты гулялі больш жвава і цікава, лепей выкарыстоўвалі флангі, пастаянна "навешвалі", "прастрэльвалі"... Неаднойчы маглі давесці лік да непрыстойнага Вова Матусевіч, Сяргей Ільіч, Павел Лутовіч, Саша Сямашка, Віталь Цімафеевіч (гэтым разам ён гуляў у полі), адзін за другім выдаваў ювелірныя пасы Шалва Гегелія. Прыхільнікі юрыстаў ад крыўды ледзь не лезлі на агароджу і не зносілі лаўкі, калі Ільіч. выкупаўшыся ў злашчаснай для мехмата лужы, не дацягнуўся да "прастрэлу" з левага фланга таго ж Шалвы. Бачачы такі нешанцунак, юрфак кідаў у нападзенне ўсё новыя і новыя сілы, агаляючы тылы. Географы, прыбадзёрыўшыся, пачалі адбівацца. Юрфак, не зразумеўшы папярэджання, усё гэтак жа захапляўся атакай. Трагедыя адбылася пасля дакладнага ўдару Ягора Канончыка. Былі яшчэ ў юрыстаў і час, і магчымасці дабіцца жаданай перавагі, але ў Матусевіча, які набегаўся, ужо запляталіся ногі, збавіў абароты Ільіч, стаміўся Лутовіч.

Потым... Потым была радасць радыёфізікаў, якія занялі першае месца, іх узнагароджанне і фотаздымкі на памяць. У гуморы былі і географы. Жартаваў з усіх Віця Толмач, не перажываў з нагоды перарвання сваёй галявой серыі лепшы бамбардзір Дзіма Кадакоў. Юрысты нібыта пасміхаліся, спрабавалі жартаваць. Але ў вачах была горыч.

У кожным турніры прынята называць тройку лепшых ігракоў, але арганізатары вырашылі гэтага не рабіць, бо не было магчымасці ўзнагародзіць хлопцаў. Але я рызыкну назваць, на мой погляд, лепшых. Самысамы — Шалва Гегелія (юрфак). За год, што прамінуў з апошняга чэмпіяната БДУ, хлопец пасталеў і цяпер лічыцца адным з наймацнейшых футбалістаў універсітэта. Шалва вучыцца на другім курсе міжнароднага адносін юрфака. Футболам ён захапляецца з дзяцінства. Адзінаццаць гадоў займаўся ў СДЮШАР "Дынама". Першы трэнер — Валянцін Дамашэвіч, пазней трэніраваўся ў Юрыя Пагальнікава і Віктара Гірко. З мінулага года абараняе колеры "Дынама-Юні" (2-я ліга).

На другім месцы — Павел Лутовіч (юрфак). Ён вучыцца на трэцім курсе юрфака, на аддзяленні правазнаўства. Выступае за клуб "Атака-Аўра-Д" (3-я ліга). Ведаю, што чытач чакае інтэрв'ю з хлопцамі, але расстроіўшыся пасля гульні з географамі, хлопцы былі не ў тым стане, каб адказваць на пытанні. Спадзяюся, што нагода і магчымасць пагаварыць у нас яшчэ будуць.

І на трэцім месцы — Міхаіл Лукашэвіч (мехмат), які расказвае пра сябе:

— Вучуся на механіка-матэматычным факультэце, на трэцім курсе, на аддзяленні матэматычнай электронікі. Будучая прафесія — інжынер-праграміст. Адным словам, электроншчык. Чаму менавіта гэтая галіна? Мне было абыякава, куды паступаць, а вучыўся я ў класе з паглыбленым вывучэннем матэматыкі, вось і палез туды, дзе быў больш абазнаны.

— Міша, крыху аб тваім футбольным жыцці на факультэце.

— У свой час мяне абмінуў лёс многіх першакурснікаў: ніколі не падаваў мячы і не сядзеў на замене. Адразу ж мае партнёры заўважылі, што гуляю някепска, і даверылі месца ў асноўным саставе.

— Вы гуляеце даволі ўпэўнена, і ствараецца ўражанне, што Вы недзе займаліся.

— Не, я не займаўся нідзе. Але гуляю за розныя каманды. Вось нядаўна выступаў за нясвіжскі клуб у фінале раёна. А літаральна хвілін пяць назад мяне папрасілі згуляць за зборную супрацоўнікаў БДУ.

— Давайце пакінем у спакоі наш футбол і пагаворым крыху аб жыцці. Што Вы любіце рабіць?

— Адпачываць.

— Але для адных адпачынак — гэта паляжаць на канапе, для другіх — гарод, а для трэціх — пагарэзаваць.

— На гародзе — гэта не маё, адразу кажу. Калі дожджык — лепей застацца на канапе, а калі сонейка — дык званю сябрам і выходзім куды-небудзь гуляць.

І на развітанне — прагноз універсітэцкіх спецыялістаў. А яны прадказваюць развіццё ў лідэрскімі пазіцыямі географаў, пачатак эры юрыстаў, з'яўленне новых цікавых каманд у эліце і больш захапляльны фінал. Што ж, пажывем — пабачым.

Вольга Каздзерка

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Заснавальнік газеты - рэктарат Беларускага дзяржаўнага універсітэта

Мінская паліграфічная фабрыка "Чырвоная зорка" МВПА імя Я.Коласа. 220079, г. Мінск, 1-ы Загарадны зав., 3.

Газета падпісана ў друк у 12.00.

30 МАЯ
Зак. 2007.
Т. 1000 экз.

220080, Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 9, паверх 4, пакоі 411-412, тэлефон 206827.

В.а. рэдактара Т.М. Казак